Однако в Беларуси были сильны позиции и другой политической силы – Российской коммунистической партии большевиков, ставшей наследницей РСДРП, I съезд, которой состоялся в 1898 г. в Минске. Большевики, сделавшие ставку на Советы как форму новой власти, сыграли главную роль в восстановлении советской власти в Беларуси после немецкой оккупации. Несмотря на то что коммунистические организации рассматривали будущее Беларуси в русле ленинской национальной политики, некоторые белорусские большевистские деятели полагали, что Беларусь может самоопределиться как автономная республика в составе РСФСР. Так, например, В. Кнорин полагал, что нечего играть в Советские республики, так как конечная цель пролетариата – единая социалистическая республика. Вместе с тем Минский Совет в декабре 1918 г. принял ряд решений, где говорилось уже не о Западном, а о Белорусском крае. Можно полагать, что такая новая позиция сформировалась и в противовес решениям Рады БНР. Коммунисты Беларуси при поддержке РСФСР начали активную подготовку к проведению в Смоленске съезда, на котором 1 января 1919 г. был принят и обнародован первый политический и юридический акт социалистической Беларуси – Манифест Временного Рабоче-Крестьянского правительства Белоруссии о провозглашении БССР. Таким образом, на наш взгляд, была восстановлена историческая справедливость относительно становления белорусской государственности как советской и социалистической. Понадобился год, чтобы выполнить резолюцию декабрьского 1917 г. Всебелорусского съезда Советов, волюнтаристски закрытого Облисполкомзапом 18 декабря 1917 г.

Первым главой правительства стал Д.Ф. Жилунович (Тишка Гартный, 1887–1937 гг.). В 1922 г. БССР, УССР, РСФСР и Закавказская Федерация (Азербайджан, Армения, Грузия) заключили договор о создании СССР, который просуществовал до 8 декабря 1991 г., когда в правительственной резиденции Вискули в Беловежской пуще президент РСФСР Б. Ельцин, Председатель Верховного Совета Беларуси С. Шушкевич, президент Украины В. Кравчук сделали совместное заявление о прекращении действия Договора 1922 г. В 1994 г. состоялись выборы первого Президента суверенной Беларуси, на которых победил А.Г. Лукашенко.

### *Список использованных источников*

1. Чыгрынаў, П.Г. Грамадская думка ў Беларусі: палітычна-гістарычны аспект. X – пачатак XX ст. : вучэб. дапам. / П.Г. Чыгрынаў. – Мінск : Акад. МУС РБ, 1996. – 228 с.

2. Луцкевіч, А. За дваццаць пяць гадоў (1903–1928) : Успаміны аб працы першых беларускіх палітычных арганізацый : Беларуская рэвалюцыйная грамада, Беларуская сацыялістычная грамада / А. Луцкевіч. – Мінск : БелСЭ, 1991. – 64 с.



3. Турук, Ф.Ф. Белорусское движение : Очерк историии национального и революционного движения белорусов : С приложением образцов белорусской нелегальной литературы, важнейших документов белорусских политических партий и национальных организаций и этнографической карты белорусского племени, составленной Е.Ф. Карским / Ф.Ф. Турук. – М. : Гос. изд-во, 1921, – 144 с.

4. Круталевич, В.А. Очерки истории государства и права Беларуси / В.А. Круталевич : под науч. ред. П.Г. Никитенко : Ин-т государства и права НАН Беларуси. – Минск : Право и экономика, 2007. – 824 с.

5. Белявцев, В.И. Ленин и Белоруссия / В.И. Белявцев. – Минск : Беларусь, 1978. – 254 с.

6. Канчер, Е. Из истории Гражданской войны в Белоруссии в 1917–1920 гг. (по личным воспоминаниям, записям и документам). Фрагменты 5-й главы / Е. Канчер. – Беларус. думка. – № 1. – 2010. – С. 92–97.

7. Канчер, Е. Из истории Гражданской войны в Белоруссии в 1917–1920 гг. (по личным воспоминаниям, записям и документам). Фрагменты 5-й главы / Е. Канчер. – Беларус. думка. – № 2. – 2010. – С. 72–79.

УДК 321 (476) (091) +94 (476)

***І.А. Саракавік***

## РЭВАЛЮЦЫЯ 1917 г. І АДНОСІНЫ ПОЛЬШЧЫ ДА БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

XX стагоддзе ўвайшло ў сусветную гісторыю такімі важнейшымі падзеямі, як Лютаўская і Кастрычніцкая рэвалюцыі 1917 г. Яны актывізавалі імкненні народаў, у тым ліку і беларускага, да сваёй дзяржаўнасці. Характэрна, што, пачынаючы з народніцкай арганізацыі «Гоман», прамаўлялася ідэя аўтаноміі Беларусі ў складзе дэмакратычнай федэратыўнай рэспублікі Расіі. Гэта ідэя выказвалася затым прадстаўнікамі як уплывовых колаў, так і левых партый, хаця яны былі падзелены сацыяльна-эканамічнымі і духоўнымі бар'ерамі [1, с. 316–327]. Аўтанамісцкая ідэя прадстаўлена і ў рашэнні II Усебеларускага з'езда палітычных партый і арганізацый і нават прапаноўвалася на Усебеларускім кангрэсе ў снежні 1917 г. На ім жа прапаноўвалася і беларуская дзяржаўнасць у форме краёвай аўтаноміі і незалежнасці.

Аднак форма дзяржаўнасці беларускага народа ў многім залежала не толькі ад яго самаго, але і ад таго геапалітычнага становішча, у якім апынулася Беларусь у гэты гістарычны час. Найперш вызначалася пазіцыяй Германіі і Расіі, войскі якіх у час Першай сусветнай вайны знаходзіліся

на нашых землях. *Немцы захапілі прыкладна 25 % тэрыторыі Беларусі з насельніцтвам звыш 2 млн чалавек,* і мелі некалькі праектаў адносна яе будучыні: занятыя землі далучыць непасрэдна да Германіі; стварыць самастойную польскую дзяржаву пад пратэктаратам Аўстрыі; прыняць канкрэтнага рашэння, зыходзячы з ходу ваенных дзеянняў. Менавіта апошні і быў прыняты. У адпаведнасці з ім Германія і праводзіла сваю палітыку на ўсходзе. *5 лістапада 1916 г. Германія і Аўстра-Венгрыя аднавілі Польскае каралеўства* ў існуючых раней межах [2, с. 8]. *Галоўнай жа мэтай нямецкага камандавання было вывесці Расію з вайны, захаваць яе як эканамічнага партнёра з яе вялізным унутраным рынкам, дабіцца ад яе пэўных уступак.*

*Па другі бок фронту* на беларускай этнічнай тэрыторыі размяшчалася расійская армія. У прыфрантавой паласе сабралася больш за мільён бежанцаў з Польшчы і заходніх раёнаў Беларусі [3, с. 577]. Царская Расія ў час вайны прытрымлівалася пазіцыі адзінай і недзялімай імперыі. Такі ж падыход меў і *Часовы ўрад*. Пра гэта сведчыць яго адмова весці перамовы з дэлегацыяй Беларускага нацыянальнага камітэта, накіраванай І Усебеларускім з'ездам палітычных партый і арганізацый у сакавіку 1917 г. наконт аўтаноміі Беларусі [4, с. 28, 31, 33]. На яго думку, тэрытарыяльная праблема будучай Расіі павінна вырашацца Усерасійскім устаноўчым сходам.

Скарыстаўшыся шэрагам унутраных і знешніх прычын у Расіі, а таксама папулісцкімі лозунгамі, паўваеннай пабудовай сваёй арганізацыі бальшавікі змаглі ў Кастрычніку ўзяць уладу ў свае рукі. Улічваючы выказванне **Ф. Энгельса** пра тое, што «*для рабочага класа не можа быць большай гістарычнай бяды, як захоп палітычнай улады ў такі час, калі ён да гэтага яшчэ не падрыхтаваны*», **Г.В. Пляханаў** прааналізаваў стан гэтай падрыхтаванасці, паказаў, што ў складзе насельніцтва ён быў малалікім (прамысловы пралетарыят Расіі складаў толькі 2,5 % ад усяго насельніцтва [5, с. 33]) і сялянства не магло стаць яго саюзнікам, бо не жадала сацыялізму. На яго думку, памылковы і погляд, што рускі рабочы пачне, а нямецкі давядзе сацыялістычную рэвалюцыю да перамогі, бо ў немцаў не склаліся ўмовы для такой рэвалюцыі. І таму, «несвоечасова захапіўшы палітычную ўладу, рускі пралетарыят не зробіць сацыяльную рэвалюцыю, а толькі выкліча грамадзянскую вайну» [6, с. 105]. Так і сталася першапачаткова.

З пункту гледжання марксізму, у Беларусі тым больш не існавала аб'ектыўных і суб'ектыўных умоў для сацыялістычнай рэвалюцыі. Індустрыялізацыя адсутнічала. Рабочы клас быў малалікім. Бальшавікі тут не мелі дастатковай сацыяльнай апоры. Аднак пасля перамогі



Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Петраградзе і ўтварэння Савецкай улады на чале з У.І. Леніным 25 кастрычніка быў утвораны Мінскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў, 26 лістапада – абласны выканкам Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў Заходняй вобласці і фронту.

СНК Расіі прыкладаў вялікія намаганні дзеля таго, каб вывесці краіну з Першай сусветнай вайны. 3 сакавіка 1918 г. сепаратны мірны дагавор паміж Германіяй, яе саюзнікамі і РСФСР быў падпісаны. Згодна з ім 85 % тэрыторыі Беларусі адыходзіла Германіі, 15 % – Савецкай Расіі. Паўночна-заходняя частка Беларусі назаўсёды адыходзіла да Германіі з назвай «Новая Усходняя Прусія». У дагаворы гаварылася, што «Россия отказывается от всякого вмешательства во внутренние дела этих областей» і што «Германия готова, как только будет заключен всеобщий мир и проведена полностью русская демобилизация, очистить территорию, лежащую восточнее» «Новай Усходняй Прусіі» [7, с. 53–54]. Пад ціскам урада РСФСР 27 жніўня 1918 г. у Берліне быў падпісаны «*Русско-Германский добавочный договор к мирному договору между Россией с одной стороны и Германией, Австро-Венгрией, Болгарией и Турцией – с другой*». У адпаведнасці з ім Германія павінна была перадаць РСФСР тэрыторыю Беларусі на ўсход ад ракі Бярэзіны за пэўны выкуп. Землі на захад ад гэтай ракі перадаваліся ёй па меры выканання «остальных финансовых обязательств, взятых на себя Россией». Германія абавязвалася, што «никоим образом не будет вмешиваться в отношения между Русским государством и его отдельными областями, и, следовательно, она в особенности не будет ни вызывать, ни поддерживать образование самостоятельных государственных организмов в этих областях» [8, с. 77]. Заручыўшыся падтрымкай Германіі, 29 жніўня 1918 г. СНК РСФСР выдаў Дэкрэт, якім абвясціў, што «ўсе дагаворы і акты, якія былі заключаны ўрадам былой Расійскай імперыі з урадамі Каралеўства Прускага і Аўстра-Венгерскай імперыі, што тычыліся падзелаў Польшчы, у сувязі з іх супярэчнасцю прынцыпу самавызначэння нацый і рэвалюцыйнай правасвядомасці рускага народа, прызнаўшага за польскім народам неад'емнае права на самавызначэнне і адзінства, – адмяняюцца гэтым беспаваротна» [9, с. 250]. Значыць, юрыдычна магла аднавіцца Рэч Паспалітая. У рэальнасці гэты акт быў фікцыяй, разлічанай на прапагандысцкі эфект, бо існаваў дагавор з Германіяй ад 27 жніўня 1918 г.

Не маючы значнай сацыяльнай апоры ўнутры Расіі, яе бальшавікі з-за тактычных меркаванняў вымушаны былі дзеля ўтрымання сваёй улады на першым часе падтрымліваць былыя нацыянальныя ўскраіны дзяржавы. Невыпадкова СНК РСФСР ужо 2 лістапада 1917 г. у *Дэкларацыі правоў народаў Расіі* абвясціў роўнасць і суверэннасць усіх народаў

Расіі; іх права на самавызначэнне аж да аддзялення і ўтварэння самастойных дзяржаў [10, с. 40]. Аднак **Ленін** заяўляў, што *гэта права будзе прадастаўляцца толькі тады, калі гэта будзе выгадна інтарэсам сацыялістычнай рэвалюцыі.*

Лістападаўская рэвалюцыя 1918 г. у Германіі і яе капітуляцыя перад краінамі Антанты падштурхнулі бальшавікоў Расіі перамяніць свае погляды адносна заходніх земляў былой імперыі. 29 лістапада была абвешчана Эстонская ССР, 17 снежня – Латвійская ССР, а 8 снежня – Літоўская ССР у межах, вызначаных раней Літоўскай Тарыбай. Таму ў пастанове Усерасійскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта (УЦВК) *«Аб абласных аб'яднаннях»* ад 23 снежня 1918 г. Заходняя вобласць РСФСР зацвярджалася ў складзе пяці губерняў: Віцебскай, Смаленскай, Магілёўскай, Мінскай і Гродзенскай. Віленская ўключалася ў склад Літоўскай ССР, хоць літоўцы ў ёй складалі не больш як 15–18 % насельніцтва, а ў самой Вільні – менш за 1 % [11, с. 8]. Як бачна, на заходніх межах былой імперыі бальшавікі ўтварылі нацыянальныя рэспублікі (УССР была абвешчана 12 (25) снежня 1917 г.), апрача Беларусі. Не ўпамінаецца яна і ў актах цэнтра. У пастанове УЦВК ад 13 лістапада 1918 г. аб ануляванні Брэст-Літоўскага дагавора ўказвалася, што працоўныя масы Расіі, Ліфляндыі, Эстляндыі, Польшчы, Літвы, Фінляндыі, Крыма і Каўказа, вызваленыя германскай рэвалюцыяй ад прыгнёту грабежніцкага дагавора, «призваны ныне сами решать свою судьбу» [12, с. 679–680]. У тэлеграме **І.І. Вацэцісу** ад 29 лістапада 1918 г. Ленін тлумачыў: «С продвижением наших войск на запад и на Украину создаются областные временные Советские правительства, призванные укрепить Советы на местах. Это обстоятельство имеет ту хорошую сторону, *что отнимает возможность у шовинистов Украины, Литвы, Латвии, Эстляндии рассматривать движение наших частей как оккупацию и создает благоприятную атмосферу для дальнейшего продвижения наших войск»* (выдзелена мной. – *І.С.*) [13, с. 234]. «Забыўся» пра Беларусь Ленін невыпадкова, тым больш што пасля таго, як Чырвоная Армія 10 снежня 1918 г. увайшла ў Мінск, старшыня Мінскага губрэўкама **І.І. Рэйнгольд** 13 снежня накіраваў тэлеграмы ў Паўночна-Заходні абласны камітэт РКП(б) і УЦВК аб неабходнасці ўтварэння Беларускай савецкай рэспублікі [14, с. 171]. Палітбюро ЦК РКП(б) і СНК РСФСР былі вядомы і розныя падыходы да праблемы беларускай дзяржаўнасці. *Кіраўнікі Заходняй вобласці* наогул не прызнавалі права беларускага народа на дзяржаўнае самавызначэнне, адзначаючы, што «белорусы не являются нацией и что те этнографические особенности, которые их отделяют от остальных русских, должны быть изжиты. Нашей задачей является не создание новых наций, а уничтожение старых национальных рогаток» [15]. *Кіраўнікі Віцебскай, Смаленскай, Магілёўскай губерняў* былі супраць як існавання Заходняй вобласці, так і ўтварэння савецкай Беларусі. Кожная губерня, на іх погляд, павінна была самастойна выходзіць на цэнтр. *Беларускі нацыянальны камітэт пры Народным камісарыяце нацыянальнасцей РСФСР і беларускія камуністычныя секцыі Масквы і Петраграда* выступалі за ўтварэнне Беларускай савецкай рэспублікі як складанай часткі Расійскай Федэрацыі. Пытанне аб утварэнні савецкай Беларусі разглядалася 21–23 снежня 1918 г. на канферэнцыі беларускіх секцый РКП(б) у Маскве [14, с. 173]. Але кіраўніцтва РСФСР не спяшалася прымаць канчатковае рашэнне. *З аднаго боку,* з пачаткам Лістападаўскай 1918 г. рэвалюцыі ў Германіі ў яго была надзея калі не на сусветную, то хаця б на еўрапейскую сацыялістычную рэвалюцыю. 9 лістапада 1918 г. **Я. Свярдлоў,** выступаючы на VIII Усерасійскім з'ездзе Саветаў, гаварыў: «Я ніколі не сумняваюся ў тым, што праз паўгода мы будзем мець моцную Савецкую ўладу. Не толькі ў краінах Аўстрыі, Венгрыі і Германіі, але і ў краінах згоды – у Францыі, Англіі і Італіі». А на І Усебеларускім з'ездзе Саветаў у лютым 1919 г. быў больш катэгарычным: «Мы напярэдадні паўстання ў Англіі, Францыі і Амерыцы» [16, с. 30]. Зразумела, што для Савецкай Расіі патрэбна было «акно» на Захад для экспарту сацыялістычнай рэвалюцыі і яе падтрымкі. Такім «акном» і павінна была стаць Беларусь. Таму яна да пары і не абвяшчалася як савецкая рэспубліка.

*З другога боку,* заходнія краіны выношвалі планы ўтварэння ўздоўж мяжы з РСФСР ад Балтыйскага да Чорнага мора шэрагу дзяржаў, своеасаблівага «санітарнага кардона». Яны павінны былі не прапускаць на Захад «бальшавіцкую заразу» і весці з ёю барацьбу. Адным з першых такую ідэю выказаў 8 снежня 1918 г. англійскі пасол у Францыі лорд **Берці** [14, с. 160]. Тады савецкі бок з мэтай захавання сацыялістычнай рэвалюцыі ў Расіі ўтварыў на заходняй мяжы шэраг буферных савецкіх рэспублік, якія аддзялялі РСФСР ад заходніх дзяржаў, не дазвалялі ім мець мяжу непасрэдна з Савецкай Расіяй. Яе кіраўнікі гатовы былі ісці на ўсё, каб толькі выратаваць рэвалюцыю. Ленін яшчэ 8 лютага 1918 г. пісаў: «...Что выше – право наций на самоопределение или социализм? Социализм выше» [17, с. 352]. Або такая заява Леніна 18 лютага 1918 г. на пасяджэнні ЦК РСДРП(б): «Здесь говорили, что они (немцы. – *І.С.*) возьмут Лифляндию и Эстляндию, но мы можем их отдать во имя революции. Если они потребуют вывода войск из Финляндии – пожалуйста, пусть они возьмут революционную Финляндию. Если мы отдадим Финляндию, Лифляндию, Эстляндию – революция не потеряна» [18, с. 337].

Становішча рэзка змянілася, калі 11 лістапада 1918 г. была абвешчана Польская незалежная дзяржава на чале з былым членам Польскай партыі сацыялістычнай **Ю. Пілсудскім.** Згодна з Малой Канстытуцыяй ён заняў найвышэйшую дзяржаўную пасаду – Начальніка краіны [19, с. 178] і быў скіраваны на тое, каб інтэграваць у адзіны дзяржаўны механізм тры часткі падзеленай Рэчы Паспалітай. Менавіта гэта акалічнасць прымусіла Палітбюро ЦК РКП(б) і СНК Савецкай Расіі прыняць рашэнне аб утварэнні Беларускай сацыялістычнай рэспублікі і тым самым ёю, як заслонаю, закрыць РСФСР ад Польшчы. На такое рашэнне паўплывала і тое, што кіраўніцтва РСФСР не жадала прызнання БНР заходнімі краінамі. У выніку 30 снежня 1918 г. Паўночна-Заходняя канферэнцыя РКП(б) у Смаленску па загадзе цэнтра прыняла рашэнне абвясціць Сацыялістычную Савецкую Рэспубліку Беларусі (ССРБ), а саму сябе – І з'ездам Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі. У склад ССРБ з'езд уключыў Віцебскую, Гродзенскую, Мінскую, Магілёўскую, Смаленскую губерні, а таксама часткі Ковенскай, Віленскай і Чарнігаўскай губерняў [20, с. 347–348]. У пераліку адсутнічала значная частка Віленскай губерні, далучанай бальшавікамі да Літоўскай ССР. 1 студзеня 1919 г. быў падпісаны Маніфест Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі, якім *абвяшчалася Беларуская савецкая незалежная рэспубліка* [21, с. 219–220]. Зразумела, што дзяржаўная незалежнасць Беларусі не была поўнай. Не паспеў урад Беларусі пачаць працу, як 16 студзеня 1919 г. ЦК РКП(б) прыняў рашэнне выдзеліць з рэспублікі Віцебскую, Магілёўскую і Смаленскую губерні, пакінуўшы ў яе складзе Мінскую і Гродзенскую [14, с. 182–183]. ЦБ КП(б)Б не пагадзілася з гэтым рашэннем. Ленін, азнаёміўшыся з яго пазіцыяй, зазначыў: «Республика – буферная и нужна постольку, поскольку граничит с другими странами. Поскольку Смоленская, Витебская и Могилевская губернии не граничат с другими странами – постольку их можно исключить» [22, с. 92].

2–3 лютага 1919 г. у Мінску працаваў І Усебеларускі з'езд Саветаў, з 230 дэлегатаў якога 213 з'яўляліся членамі РКП(б), 17 – спачуваючымі бальшавікам. Яны прадстаўлялі Мінскую, Смаленскую, Віленскую, Гродзенскую, Магілёўскую губерні, а таксама бежанскія арганізацыі [23, с. 143]. 3 лютага ён *прыняў першую Канстытуцыю ССРБ,* чым заклаў прававую аснову дзяржаўнага і грамадскага ладу [24, с. 187–190], а таксама *Дэкларацыю аб аб'яднанні Беларусі і Літвы ў адзіную савецкую рэспубліку.* 27 лютага 1919 г. на пасяджэнні ЦВК Літоўскай ССР і ЦВК ССРБ было прынята рашэнне аб утварэнні ССР Літвы і Беларусі (ЛітБел) з яе ЦВК і СНК [23, с.148–149]. У складзе гэтых органаў не знайшлося месца бальшавікам-беларусам [16, с. 46].



Але ЛітБел праіснавала нядоўга: 2 сакавіка палякі захапілі Слонім, 21 красавіка – Вільню, 8 жніўня – Мінск. Восенню 1919 г. уся тэрыторыя ЛітБел была занята польскімі войскамі. Мяжа ўстанавілася на лініі Дзісна – Бабруйск і па рацэ Бярэзіне. Хуткія поспехі польскіх войскаў тлумачыліся не столькі іх лепшай падрыхтаванасцю, спрыяльным ваенна-тактычным становішчам, чаго нельга выключаць, колькі паводзінамі пераважнай часткі насельніцтва – сялянства. Акадэмік **І.М. Ігнаценка** адзначае, што малазямельныя сяляне не падтрымалі савецкую ўладу з-за памылак кіраўніцтва ЛітБела, «что, естественно, способствовало быстрому продвижению польских войск по территории республики» [14, с. 195]. На сярэдзіну ліпеня 1919 г. ЛітБел фактычна перастала існаваць. 2 красавіка 1920 г. урад РСФСР прызнаў незалежнасць буржуазнай Літвы, а 12 ліпеня гэтага ж года падпісаў у Маскве мірны дагавор з ёю, што *юрыдычна афармлялася ліквідацыя Літоўска-Беларускай ССР.* Гэта дзяржава, па меркаванні **В. Кнорына**, паступова «траціла сваю ўяўную незалежнасць і станавілася фактычна часткай РСФСР, адміністрацыйна падпарадкаванай Маскве нароўні з астатнімі губернямі. Гэта цэлая эпапея развіцця Беларусі, зараджэння, росту і завядання нашай рэспублікі...» [25, с. 47].

У самой Польшчы не існавала адзінага пункта гледжання адносна дзяржаўнасці Беларусі. Яскрава выявіліся два пункты гледжання яе палітычнай эліты. На погляд **П. Вандзіча**, польскія нацыяналісты меркавалі анексіраваць Заходнюю Беларусь – каталіцкую і падвергнутую паланізацыі, але не зацікаўлены ў яе "рускай", праваслаўнай часткі [26, с. 509]. Сапраўды, нацыянальныя дэмакраты на чале з **Р. Дмоўскім** актыўна выступалі ў падтрымку інкарпарацыйнай праграмы. Яна прадугледжвала далучэнне да Польшчы ўсходніх тэрыторый былой Рэчы Паспалітай. Беларусаў і ўкраінцаў меркавалася паступова асіміляваць, каб яны з цягам часу сталі палякамі. Яго галоўным палітычным апанентам выступаў **Ю. Пілсудскі**, родам з Віленшчыны, адзін з лідараў Польскай сацыялістычнай партыі. У разглядаемы час прапанаваў федэратыўную праграму, якая прадугледжвала стварэнне федэрацыі суверэнных дзяржаў. На першым этапе ў яе, меркавалася, павінны былі ўвайсці Польшча, Літва, Беларусь і Украіна [19, с. 190], уклаўшы ў форму гэтай дзяржавы польскі змест. Затым да яе планавалася далучыць краіны Цэнтральна-Усходняй Еўропы ад Балтыйскага мора да Чорнага і Адрыятычнага. Такая федэрацыя, на яго погляд, магла б пярэчыць дамінаванню Германіі і Савецкай Расіі. Аднак у польскай знешняй палітыцы перамагла інкарпарацыйная пазіцыя нацыянальных дэмакратаў. Характэрна, што на трэці дзень пасля заняцця палякамі Вільні Ю. Пілсудскі выступіў з адоз-

вай *«Да жыхароў былога Вялікага княства Літоўскага»*. Ён прапанаваў ім самім вырашаць унутраныя, рэлігійныя і нацыянальныя пытанні, стварыць *федэрацыю Польшчы, Беларусі, Літвы і Украіны ў межах 1772 г.*, Вільні, Гродну і Коўну прапаноўваў статус асобных кантонаў. Аднак такі план не задавальняў па розных прычынах усе бакі.

8 снежня 1919 г. Вярхоўны савет Антанты вызначыў усходнюю мяжу Польшчы. Яна атрымала назву «*лініі Керзона*» па імені яе ініцыятара міністра замежных спраў Вялікабрытаніі **Дж. Керзона** [27, с. 576]. Не жадаючы абвастраць адносіны з Антантай, Ю. Пілсудскі скарэктаваў свае ваенныя планы – паставіў задачу «вызваліць» ад Саветаў тэрыторыю Беларусі і Украіны, якая ўваходзіла ў склад Рэчы Паспалітай да яе першага падзелу ў 1772 г. Землі на захад ад мяжы, устаноўленай у 1793 г., планавалася ўключыць у склад Польшчы, а на прасторы паміж усходняй мяжой 1793 г. і мяжой, існаваўшай да 1772 г., утварыць буферныя і саюзныя з Польшчай Беларускую і Украінскую дзяржавы, на землях якіх свабодна і гарантавана прысутнічаў бы палітычны, эканамічны і духоўны польскі ўплыў [28, с. 23]. З гэтай мэтай польскі ўрад **І. Падарэўскага** пачаў перамовы са старшынёй Савета народных міністраў БНР **А. Луцкевічам**, які ў цэлым пагадзіўся з польскімі прапановамі. Ён лічыў, што лепш мець аўтаномію Беларусі і тым самым зберагчы асноўныя этнічныя землі беларусаў ад рабаўніцтва, чым нічога не мець: Савецкая Расія і Германія не прапаноўвалі нават гэтага. Прапольскую пазіцыю займалі і такія беларускія дзеячы, як **Я. Лёсік, А. Смоліч, І. Серада, В. Іваноўскі, К. Цярэшчанка, С. Рак-Міхайлоўскі** і інш. Але значная частка беларускіх нацыянал-дэмакратаў арыентаваліся на краіны Антанты і былі гатовы да таго, каб міжнародныя ваенныя сілы прынялі пад сваю ахову тэрыторыю БНР [16, с. 68, 71].

У такіх умовах 12 снежня 1919 г. у Мінску з дазволу польскіх акупацыйных улад *пачала працу* Рада БНР, расколатая на дзве часткі: *эсэры і сацыялісты-федэралісты выступалі супраць пагаднення з урадам Польшчы,* а група БНК *на чале з сацыял-дэмакратамі імкнулася, наадварот, заключыць дагавор з палякамі, ідучы насустрач пажаданням* Ю. Пілсудскага *аб прыняцці* Радай БНР *Граматы аб федэрацыі Беларусі з Польшчай.* У выніку 50 з 87 членаў Рады з ліку эсэраў і сацыялістаў-федэралістаў абвясцілі Раду праваздольнай, выключыўшы са свайго складу сацыял-дэмакратаў і іх паплечнікаў, пацвердзілі Устаўную грамату ад 25 сакавіка 1918 г. аб незалежнасці Беларусі, выступілі супраць плебісцыту наконт польскай улады ў краі, выбралі новы склад прэзідыума Рады і замянілі ўрад А. Луцкевіча ўрадам **В. Ластоўскага.** На чале Народнай рады стаў **П. Крачэўскі**, а яго намеснікамі – **П. Бадунова** і **В. Захарка**. Пасля такога рашэння яны вымушаны былі эмігрыраваць у Германію [29, с. 67]. Меншасць Рады (37 чалавек) абвясціла сябе Найвышэйшай радай і пацвердзіла паўнамоцтвы ўрада А. Луцкевіча. Найвышэйшую раду ўзначаліў сацыял-дэмакрат **Я. Лёсік** [30, с. 388]. Улічваючы гэта, польскія ўлады разагналі Народную раду за ўзурпацыю паўнамоцтваў, арыштавалі шэраг яе членаў, перагледзелі сваю палітыку адносна Беларусі. Ю. Пілсудскі на нарадзе ў Вільні 1 лютага 1920 г. выказаўся за культурную аўтаномію Беларусі, а прэм'ер-міністр Польшчы **Л. Скульскі** 22 красавіка гэтага ж года заявіў, што ўрад Польшчы вырашыў прызнаць права насельніцтва Беларусі на самакіраванне ў складзе Польшчы, але не падтрымліваў яго імкнення да дзяржаўнай незалежнасці. Аднак 30 красавіка 1920 г. Цэнтральная беларуская рада Віленшчыны і Гродна, БНК у Мінску выступілі супраць гэтай заявы, адстойваючы дзяржаўную незалежнасць Беларусі. У маі 1920 г. Найвышэйшая рада БНР, улічваючы складанае становішча на польска-савецкім фронце, прапанавала Польшчы заключыць дагавор тыпу Люблінскай уніі. Паводле яго Беларусь і Польшча знаходзіліся б у федэратыўнай сувязі, мелі б агульны сойм, але свае ўрады, войскі, заканадаўства, фінансы. Польскі бок не адказаў на гэту прапанову. У наступным месяцы Найвышэйшая рада дамагалася прызнання незалежнасці БНР і перадачы Беларусі да склікання Устаноўчага сойма пад пратэктарат Лігі Нацый [30, с. 388]. Аднак апошняя не лічыла беларускае пытанне важным.

Сапраўдныя адносіны Польшчы да суверэннасці Беларусі праявіліся ў сувязі з заключэннем Рыжскага мірнага дагавора. Перагаворы з Польшчай вяла расійска-ўкраінская дэлегацыя на чале з членам ЦК РКП(б) А. Іофэ. Ён адкрыта гаварыў аб прычынах перадачы Літве Вільні з краем у 1920 г.: «Товарищи, есть ли о чем говорить. Сейчас мы ведем войну с Польшей. Уступая жадным литовским ксендзам белорусскую территорию с гор. Вильня, мы, благодаря этому, не только обеспечиваем наш правый фланг, но в некоторых случаях получаем и помощь со стороны Литвы. Если мы Польшу победим, то и дни клерикально-буржуазной Литвы будут сочтены. Если же нам придется отступить вглубь Белоруссии, то мы оставляем этой ксендзовской Литве такое количество белорусского населения, которого она никогда не переварит. В результате недоразумений между литовцами и белорусами, которые мы считаем неизбежными, мы будем иметь революцию, которая, в свою очередь, сотрет с лица земли клерикально-буржуазную Литву» [31, с. 72–73].

Згодна з **У.Е. Снапкоўскім** польская дэлегацыя не супярэчыла ўдзелу УССР у перамовах, але рашуча выступіла, як і дэлегацыя РСФСР, су-

праць удзелу ў яе працы дэлегацыі ССРБ, адмаўляючы за ёй статус незалежнай і суверэннай дзяржавы [32, с. 111]. *18 сакавіка 1921 г. у Рызе быў падпісаны Мірны дагавор паміж Расіяй і Украінай з аднаго боку і Польшчай – з другога.* Бакі прызнавалі незалежнасць Украіны і Беларусі і вызначылі паміж сабой мяжу. Асобам рускай, украінскай і беларускай нацыянальнасцей, якія пражывалі ў Польшчы, прадастаўляліся ўсе правы на свабоднае развіццё культуры, мовы і выкананне рэлігійных абрадаў. Расія і Украіна таксама абавязваліся асобам польскай нацыянальнасці прадаставіць тыя ж правы на тэрыторыі Расіі, Украіны і Беларусі [33, с. 12–14, 17].

Такім чынам, выкладзены матэрыял дазваляе заключыць, што рэвалюцыі 1917 г. у Расіі падштурхнулі рух беларусаў у канчатковым выніку да дзяржаўнай незалежнасці. Аднак вырашэнне гэтага пытання ў многім залежала ад пазіцыі Савецкай Расіі, Германіі, а таксама Польшчы. Апошняя не прадаставіла ёй не толькі дзяржаўнага суверэнітэта, але нават культурна-нацыянальнай аўтаноміі, што супярэчыла нормам Рыжскага мірнага дагавора. У адрозненне ад Польшчы, РСФСР на частцы этнічнай тэрыторыі беларусаў дазволіла сфарміраваць беларускую дзяржаўнасць на савецкай аснове. Не трэба прыніжаць значэнне гэтага факта для беларусаў, бо ні Германія, ні Польшча не пайшлі на такі крок. Але нельга ўзвялічваць гэту падзею, таму што РСФСР пры ўтварэнні ССРБ кіравалася сваімі стратэгічнымі і тактычнымі інтарэсамі.

### *Спіс выкарыстаных крыніц*


1. Запруднік, Я. Справа аўтаноміі Беларусі ў першай Думе і «Наша ніва» / Я. Запруднік // З гісторыяй на «Вы» : Вып. 3. – Мінск : Маст. літ., 1994. – 351 с.
2. Літаратура і мастацтва. – 1990. – 13 снеж.
3. Беларусь : энцыкл. давед. – Мінск : БелЭн, 1995. – 800 с.
4. Пратакол з’езду беларускіх нацыянальных арганізацый у Мінску 25–27 марта 1917 г. // Спадчына. – 1990. – № 4. – С. 29–33.
5. Нарысы гісторыі Беларусі : у 2 ч. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 1994 – 1995. – Ч. 2. – 1995. – 560 с.
6. Плеханов, Г.В. Открытое письмо к петроградским рабочим / Г.В. Плеханов // Вопр. истории. – 1989. – № 12. – С. 103–106.
7. Мирный договор между Россией с одной стороны и Германией, Австро-Венгрией, Болгарией и Турцией – с другой // Спадчына. – 1993. – № 2. – С. 52–57.
8. Русско-германский добавочный договор к мирному договору между Россией с одной стороны и Германией, Австро-Венгрией, Болгарией и Турцией – с другой от 27 августа 1918 г. // Спадчына. – 1993. – № 3. – С. 78–81.
9. Декреты Советской власти : в 13 т. – Т. 3. – М. : Политиздат, 1964. – 664 с.
10. Декреты Советской власти : в 13 т. – Т. 1. – М. : Политиздат, 1957. – 640 с.
11. Юхо, Я. Фармаванне тэрыторыі беларусаў / Я. Юхо // Спадчына. – 1991. – № 6. – С. 2–11.





12. Советско-германские отношения от переговоров в Брест-Литовске до подписания Рапалльского договора. Сборник документов : в 2 т. – М. : Политиздат, 1968–1971. – Т. 1 (1917–1918 гг.). – М. : Политиздат, 1968. – 758 с.
13. Ленин, В.И. Телеграмма Главкому И.И. Вацетису / В.И. Ленин // Полное собрание сочинений. – М. : Изд-во полит. лит., 1969. – Т. 37. – С. 234.
14. Игнатенко, И.М. Октябрьская революция и самоопределение Белоруссии / И.М. Игнатенко. – Минск : Навука і тэхніка, 1992. – 254 с.
15. Звезда. – 1918. – 6 окт.
16. Круталевіч, В.А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі (1917–1945 гг.) / В.А. Круталевіч, І.А. Юхо. – Мінск : Беларусь, 1998. – 238 с.
17. Ленин, В.И. О революционной фразе / В.И. Ленин // Полное собрание сочинений. – М. : Изд-во полит. лит., 1974. – Т. 35. – С. 343–353.
18. Ленин, В.И. Речи на заседании ЦК РСДРП(б) 18 февраля 1918 г. (вечером) / В.И. Ленин // Полное собрание сочинений. – М. : Изд-во полит. лит., 1974. – Т. 35. – С. 336–338.
19. Нарыс гісторыі Польскай Дзяржавы і Народа. X–XXI стст. – Варшава : Польскі ін-т у Мінску, 2005. – 312 с.
20. Образование СССР. Сборник документов. 1917–1924 гг. : сб. док. – М. : АН СССР, 1949. – 471 с.
21. Вішнеўскі, А.Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах / А.Ф. Вішнеўскі, Я.А. Юхо. – Мінск : Акад. МУС Рэсп. Беларусь, 1998. – 311 с.
22. 1 января 1919 года: Временное рабоче-крестьянское советское правительство Белоруссии : док. и материалы / сост. В.Д. Селеменев (рук.) [и др.] ; науч. ред. М.Ф. Шумейко. – Минск : Лимариус, 2005. – 304 с.
23. Гісторыя Беларускай ССР : у 5 т. / рэдкал.: І.М. Ігнаценка (старшыня) [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1972–1975. – Т. 3: Перамога Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і пабудова сацыялізму ў БССР (1917–1937 гг.) / І.Я. Марчанка (гал. рэд.) [і інш.]. – 1973. – 696 с.
24. История Советской Конституции. 1917–1956 гг. – М. : Госюриздат, 1957. – 1046 с.
25. Кнорин, В.Г. Избранные статьи и речи / В.Г. Кнорин. – Минск : Беларусь, 1990. – 303 с.
26. Вандзіч, П. Дваццаты век / П. Вандзіч // История Центрально-Восточной Европы / Наталья Алексюн, Даниэль Бовуа, Мари-Элизабет Дюкрё, Ежи Клочовский, Генрик Самсанович, Петр Вандич; пер. с фр.: М.Ю. Некрасов, А.Ю. Карачинский, И.А. Эгипти. – СПб. : Евразия, 2009. – 1120 с.
27. Советский энциклопедический словарь. – М. : Совет. энцикл., 1979. – 1600 с.
28. Волаціч, М. Лінія Кэрзона на фоне падзеяў і тэрытарыяльных зьменаў у Усходняй Эўропе / М. Волаціч // Спадчына. – 1993. – № 6. – С. 16 – 33.
29. Глагоўская, Г. Васіль Захарка – другі Прэзідэнт БНР / Г. Глагоўская // Спадчына. – 1994. – № 1. – С. 70 – 74.
30. Сідарэвіч, А.М. Беларуская Народная Рэспубліка // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Т. 1. – Мінск : БелЭн, 1993. – 494 с.

31. Пратэст Захаркі прэзідэнту Летувы // Спадчына. – 1994. – № 1. – С. 72–74.
32. Снапкоўскі, У.Е. Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі : вучэб. дапам. для студэнтаў фак. міжнар. адносін : у 2 ч. – Ч. 2. Ад канца XVIII да пачатку XXI ст. / У.Е. Снапкоўскі. – Мінск : БДУ, 2004. – 303 с.
33. Мирный договор между Россией и Украиной с одной стороны и Польшей – с другой // Спадчына. – 1993. – № 4. – С. 12–22.

УДК 947.6 "1917/1991"

*І.У. Вішнеўская*

## КАНЦЭПЦЫЯ НАЦЫЯНАЛЬНА-ДЗЯРЖАЎНАГА БУДАЎНІЦТВА І ШЛЯХІ ЯЕ РЭАЛІЗАЦЫІ Ў БССР

Дасягненне дзяржаўнай незалежнасці складае сутнасць і асноўны змест нацыянальнай ідэалогіі кожнага народа, які знаходзіцца ў залежным стане ад іншай нацыі. Беларускі народ не выключэнне. Пачынаючы з другой паловы XIX ст. у асяродку нацыянальна арыентаванай беларускай інтэлігенцыі выпрацоўваюцца разнастайныя канцэпцыі дзяржаўнага самавызначэння. Кожная прадстаўляла пэўны праект утварэння беларускай дзяржавы. У аснову большасці такіх праектаў была пакладзена праграма Беларускай Сацыялістычнай Грамады, якая звязвала дзяржаўнае самавызначэнне беларусаў з дэмакратычнай рэвалюцыяй у Расіі і звяржэннем самаўладдзя. Беларусь бачылася краёвай (тэрытарыяльнай) аўтаноміяй у складзе расійскай рэспублікі з уласным парламентам (соймам) і выразным размежаваннем кампетэнцый федэральных і краёвых органаў.

Пасля рэвалюцыйных падзей 1917 г. выявіліся два шляхі пабудовы незалежнай беларускай дзяржавы: тэрытарыяльная аўтаномія, як частка агульнай расійскай рэспублікі і ўнітарная беларуская суверэнная рэспубліка. Апошні праект быў упершыню сфармуляваны Вацлавам Ластоўскім, ідэолагам беларускага адраджэння, стваральнікам палітычнай арганізацыі "Сувязь незалежнасці і непадзельнасці Беларусі" (1916 г.). Спроба рэалізацыі гэтага праекта была прадпрынята Радай Беларускай Народнай Рэспублікі ў сакавіку 1918 г., але, на жаль, не мела практычнага выніку.

Фактычна беларуская дзяржава ўзнікла ў савецкім варыянце 1 студзеня 1919 г. у выніку намаганняў беларускіх пракамуністычных сіл (беларускія секцыі РСДРП). Але працэс дзяржаўнага станаўлення быў замаруджаны Грамадзянскай вайной, адмоўнымі адносінамі да факта дзяржаўнага самавызначэння Беларусі з боку суседніх краін, а таксама неразуменнем важнасці гэтага працэсу самімі беларусамі. Таму практычная рэалізацыя ідэі дзяржаўнага будаўніцтва пачынаецца толькі з 1920 г.



31 ліпеня 1920 г. была абвешчана Дэкларацыя аб незалежнасці БССР, у якой пацвярджаліся асноўныя палітычныя і гаспадарчыя прынцыпы беларускай савецкай дзяржаўнасці, заяўленыя пры ўтварэнні БССР і юрыдычна замацаваныя ў рашэннях І Усебеларускага з'езда Саветаў рабочых, сялянскіх, батрацкіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў 2–3 лютага 1919 г. У Дэкларацыі аб незалежнасці БССР падкрэслівалася, што рэспубліка з'яўляецца суверэннай савецкай дзяржавай.

Далейшае канстытуцыйнае афармленне Беларускай ССР было здзейснена на ІІ Усебеларускім з'ездзе Саветаў рабочых, сялянскіх, батрацкіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў (снежань 1920 г.). Нягледзячы на тое, што ў дапаўненнях да Канстытуцыі ССР Беларусі, прынятых на гэтым з'ездзе, пытанне аб суверэннасці рэспублікі прама не ставілася, у прывітальных зваротах да РСФСР і УССР гаварылася, што "ў аснову ўсіх далейшых узаемаадносін паміж ССРБ, Расійскай і Украінскай савецкімі рэспублікамі павінна легчы прызнанне незалежнасці ССРБ, заяўленае ад імя УЦВК на І з'ездзе Саветаў рабочых, сялянскіх, батрацкіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў Беларусі." [1, с. 251]. Па сутнасці, на І Усебеларускім з'ездзе Саветаў былі вызначаны не толькі прынцыпы аб'яднання савецкіх рэспублік у саюз, але і форма гэтага саюза. Так, у Дэкларацыі "Аб устанаўленні цеснай федэратыўнай сувязі паміж БССР і РСФСР" падкрэслівалася, што "толькі свабодны дабравольны саюз працоўных усіх незалежных савецкіх рэспублік забяспечыць перамогу рабочых і сялян у іх барацьбе з усім астатнім капіталістычным светам." [2, с. 225]. У сувязі з гэтым з'езд пастанаўляў пачаць перагаворы з РСФСР па ўстанаўленні федэратыўнай сувязі паміж дзвюма дзяржавамі і звярнуцца з прапановаю да ўсіх незалежных савецкіх рэспублік далучыцца да перагаворнага працэсу.

Якасна новыя ўзаемаадносіны БССР з РСФСР заканадаўча былі замацаваны ў Саюзным рабоча-сялянскім дагаворы ад 16 студзеня 1921 г. У ім прызнавалася "незалежнасць і суверэннасць кожнага з дагаворных бакоў", падкрэслівалася, што "з самаго факта ранейшай прыналежнасці тэрыторыі ССРБ да былой Расійскай імперыі для ССРБ не вынікае ніякіх абавязацельстваў у адносінах да каго б там ні было" [1, с. 265–266]. Галоўнымі мэтамі заключэння саюзнага дагавора абвяшчаліся абарона краін, а таксама інтарэсы гаспадарчага будаўніцтва. Таму саюз паміж дзвюма савецкімі дзяржавамі характарызаваўся як ваенна-гаспадарчы. Форма і змест саюзнага дагавора сведчаць аб тым, што ас-